

Полацкая карцінная галерэя.

*друкарня*), выдавала час. *«Месенчнік палоцкі»*. *А. П. Грыцкевіч.*

**ПОЛАЦКАЯ КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ,** аддзел выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Полацкага дзярж. гіст.-археал. запаведніка. Адкрыты 20.2.1981. Плошча экспазіцыі 500 $м^2$. У галерэі зберагаюцца творы бел. сав. жывапісцаў, графікаў і скульптараў В. Бялыніцкага-Бірулі, Г. Вашчанкі, В. Грамыкі, Я. Зайцава, А. Кашкурэвіча, А. Марачкіна, Г. Паплаўскага, М. Савіцкага, В. Стальмашонка, Н. Шчаснай і інш. Памяшканне П. к. г. выкарыстоўваецца для перасоўных выставак. Размешчана ў былой царкве Полацкага Богаяўленскага манастыра. *Л. В. Ластачкіна.*

**ПОЛАЦКАЯ КАФЛЯ,** архітэктурна-дэкаратыўная кераміка 14—18 ст. з Полацка. Кафля 14—15 ст. гаршковая; вырабы 14 ст. (найб. ранняя датавана 1304) маюць цыліндрычнае тулава даўж. да 19—20 см, круглае вусце; у 15 ст. пашыраны вырабы з крыжападобным вусцем і праразной пласцінай, а таксама пячныя гзымсы, аздобленыя шматпялёсткавымі разеткамі. Кафля 15—18 ст. каробчатая — тэракотавая (15 — 1-я пал. 16 ст.) і пакрытая зялёнай і карычневай палівай (з сярэдзіны 16 ст.), аздоблена рэльефнымі выявамі чалавека, фантастычных істот. П. к. 2-й пал. 16—18 ст. мае прамавугольную або квадратную вонкавую пласціну, аздобленую рэльефным геам. арнаментам, раслiннымі, геральдычнымі выявамі, надпісамі. У аздабленні кафлі 2-й пал. 17 ст. шырока выкарыстоўвалі дывановы арнамент. Кафля 18 ст. паліваная, дэкор мае барочны характар.





**Полацкая кафля** (зверху ўніз). Злева: гаршковая 14 ст. і геральдычная 1-й пал. 17 ст. Справа: кратавая 15 ст., тэракотавая 15 ст. і дывановая 2-й пал. 17 ст.

*Літ.:* Паничева Л. Г. Полоцкая архитектурно-декоративная керамика XIV—XVII вв.— Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института археологии АН СССР, 1980, в. 160; я е ж. Хронология белорусских изразцов XIV—XVII вв.— Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института археологии АН СССР, 1984, в. 179. *А. А. Трусаў.*

**ПОЛАЦКАЯ НАРОДНАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА** клуба мясакамбіната. Створана ў 1970, з 1980 мае званне народнай. Арганізатар і кіраўнік Т. Швайко.



Удзельнікі Полацкай народнай харавой капэлы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ